**Піскун Н.Д.,** *суіскальнік*

# СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ БАТЛЕЕЧНАГА ПРАДСТАЎЛЕННЯ «ЦАР ІРАД» ЯК АДНА З ГАЛОЎНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ ХАРАКТАРУ КАЛЯДНАЙ ДРАМЫ БЕЛАРУСАЎ

Дзеля вывучэння прыроды і функцыяніравання грамадства неабходным з'яўляецца аналіз свядомасці чалавека. Перш за ўсё гэта ідэалагічныя, грамадска-псіхалагічныя і мастацкія формы засваення рэчаіснасці. Пытанне вывучэння адносін чалавека, які жыў у сярэднія вякі, да самога сябе ўскладняецца адсутнасцю крыніц. Прамога шляху пазнання настрою думак чалавека таго часу няма. Адным са спосабаў разгляду гэтага пытання з'яўляецца аналіз сур'ёзнай часткі батлеечнай драмы «Цар Ірад» — найболеш цікавага віду тэатральнай творчасці Беларусі XVI - пач.XX ст. Зыходзячы з этнаграфічных запісаў тэкстаў батлейкі і праводзячы аналогіі з блізкімі па рэпертуару вертэпам і шопкай, магчыма з пэўнай доляй умоўнасці ўявіць сабе, што ішло на яе сцэне.

Нам цікава высветліць прычыны, якія дазволілі батлеечным прадстаўленням, спачатку ўзнікшым з літургічнай драмы, паступова секулярызаваць у тэатральных прадстаўленнях рэлігійныя паняцці і вобразы.

Перыяд XVI - XVIII стст. быў вельмі цяжкі ў жыцці беларускага народа. Аслабленне ўплыву праваслаўнай царквы пасля Брэсцкай уніі 1569 г., актыўны выхад на палітычную арэну каталіцкай царквы знайшлі адбітак у пастаноўках батлеечных драм і адносінах да іх.

Спачатку батлейшчыкамі былі галоўным чынам навучэнцы духоўных школ і семінарый. Яны наладжвалі батлейкавыя паказы ў мястэчках і вёсках. Потым батлейка як від народнага тэатра стала заняткам гараджан, а пазней і сялян. Гэта стала

магчымым дзякуючы забароне паказаў лялечных прадстаўленняў ў касцёлах. Звязаная спачатку з літургічнай драмай нараджэння Хрыста, батлейка параўнаўча хутка вызваляецца ад кананічнага ўплыву біблейскіх тэкстаў, і рэлігійныя дзеянні выцясняюцца народна-бытавымі камічнымі сцэнкамі. Можна заўважыць, што свята нараджэння Хрыста к канцу XIX стагоддзя набыло выгляд традыцыйнай застаўкі, даніны калядам, у час якіх пачыналіся батлеечныя паказы, а асноўны найбольш пашыраны біблейскі сюжэт «Цар Ірад» трактаваўся адвольна і апакрыфічна, і нават парушалася самая «святасць» падзейнага раду, і біблейскі міф падаваўся як народная легенда.

Ва ўмовах сацыяльнай несправядлівасці, бязмежнай эксплуатацыі сялянства міф пра цара Ірада, цара-гвалтаўніка, успрымаўся гледачамі па-сучаснаму. А што цікава, цар-забойца ў батлейцы нават у Смерці спрабуе выгандляваць сваё жыццё. Чорт і Д'ябал як маглі пацяшаліся з Ірада, адпраўляючы яго ў пекла, абяцаючы яму там выпіўку і гульню ў карты, радуючыся, што з яго выйдзе нядрэнная пашпіўка, а то і добрая порцыя топленага сала. Нават Анёл паводзіў сябе на сцэне даволі вольна, пакідаў сцэну прытанцоўваючы.

А Змей-Спакуснік галопам праскокваў па сцэне перад пачаткам спектакля. Услаўляў Хрыста цар Давід, які памер задоўга да яго нараджэння. Сцэна выгнання Адама з Евай з раю ў апошніх паказах наогул не мела ніякага дачынення да надзей ў Віфлееме. Усе гэта сведчыць аб тым, што народ складаў свой варыянт «Свяшчэннай гісторыі». Камічнымі з'яўляюцца паводзіны ксяндза, які вырашыў перад смерцю адпусціць грахі Ірада, спрабуючы «заблудшую душу паганца ўзяць ва ўлонне каталіцкае». А наяўнасць 14 тысяч забітых немаўлятак мужчынскага полу? Ці не ёсць гэтая фантастычная лічба прамым сведчаннем народнай творчасці?!

Адпаведнымі былі адносіны да паказаў духавенства і шляхты, таму батлеечнікі былі вымушаны з гэтым лічыцца. Напрыклад, пастаноўкі Патупчыка з Докшыц мелі двоякі характар. Калі яго запрашалі ў дамы докшыцкага начальства, дык ён дэманстраваў рэпертуар на тэмы евангельскіх падзей. Біблейскія

персанажы былі апрануты ў народную вопратку. Такія паказы абыходзіліся без эксцэсаў. Крыху інакш успрымаліся начальствам пастаноўкі, дзе Патупчык капіраваў персанажаў з жыцця. Апосталаў і вешчуноў ён ствараў па «вобразу і падабенству» мясцовага служкі культа і тых святароў, якія прыязджалі на фэст. Вельмі часта за скажэнне вобразаў біблейскіх і евангельскіх герояў ён трапляў у няміласць мясцовага святара і прыстава. Здараліся выпадкі, калі на вачах у публікі ў яго забіралі і ламалі лялькі. Але забараніць прадстаўленне ўлады не адважваліся, бо пабойваліся народа.

Свае адносіны да дзеяння батлейшчыкі паказвалі і ў вопратцы, і ў рэквізіце. Для сур'ёзных персанажаў выкарыстоўваўся салдацкі мундзір з адметнымі дэталямі (цар Ірад), які ўжо ўжываўся ў гульнях-паказах народнай драмы і ўспрымаўся сялянамі як маскарадны касцюм. Асноўны прадмет - трон быў спецыяльна зроблены з дрэва, скіпетр замяняла палка. Таксама ў дзеянні выкарыстоўваліся так званыя вайсковыя прыёмы. Яны звязаны з ужываннем удзельнікамі-персанажамі вайсковых прадпісанняў: уваходы, выхады батлеечных персанажаў, іх рапарты, страявы крок, маніпуляцыі з шаблямі і г.д.

Такім чынам, у працэсе развіцця батлейка ўсе больш і больш адыходзіла ад рэлігійнага, кананічнага тлумачэння біблейскіх сюжэтаў. У першай частцы спектакля ў цэнтры былі камедыйныя сцэнкі, а эпізоды, звязаныя з нараджэннем Хрыста, рабіліся чыста фармальнымі (другараднымі).

Зыходзячы з аналізу батлеечных тэкстаў можна зрабіць вывад, што нізавыя слаі народа, якія на той час былі непісьменныя, выражалі свае адносіны да навакольнага свету пры дапамозе пераасэнсавання кананічных тэкстаў і трансфармацыі іх у духу свайго быту і жыцця. Такім чынам, батлейка ўплывала на светапогляд чалавека ў сярэднявеччы.